# Адкрыццё міні-выставы “POLIN. Адпачні тут” на выходных

## 29-30.03.2025

**Запрашаем у Прастору сямейнай адукацыі “U króla Maciusia” на творчае мерапрыемства, прысвечанае адкрыццю новай міні-выставы, і на спатканне з яе аўтаркай – ілюстратаркай Юліяй Канечнай**

- 29 сакавіка 14:00-18:00, а таксама 30 сакавіка 11:00-18:00
- Уваход на міні-выставу **бясплатны**, без папярэдняй рэгістрацыі
- Безбар’ерная прастора
- У прасторы ёсць гукаізаляцыйныя навушнікі, якімі можна карыстацца падчас наведвання выставы
- На выставе дзейнічае рэгламент Прасторы сямейнай адукацыі “U króla Maciusia”

Хочаце крыху спакою і адпачынку? Ці цікава вам, хто завітаў у Прастору сямейнай адукацыі «U króla Maciusia»? У нас ёсць для вас сюрпрыз! У апошнія сакавіцкія выходныя адкрываем новую міні-выставу “Адпачні тут”. Яе аўтаркай з’яўляецца ілюстратарка Юлія Канечная.

У нашай прасторы вырасце лес, а ў яго лістах і галінках знойдзеце каляровых жывёлак. У вас будзе магчымасць лепей з імі пазнаёміцца, калі будзеце разгадваць загадкі! Мастачка намалюе для вас любімых жывёлаў, а вы сваімі рукамі аздобіце іх рамкамі. Таксама вы зможаце дакладней зразумець, якія формы адпачынку вам больш пасуюць.

Гэта будуць выходныя, поўныя забаваў, творчых актыўнасцяў і рэлаксу!

## Праграма

**Намалюй гэта для мяне!**

- 29-30 сакавіка, 14:00-15:30

Падчас сустрэчы з мастачкай Юліяй Канечнай у вас будзе магчымасць папрасіць намаляваць сваю любімую жывёлінку. Вы ўжо ведаеце, каго выбраць?

**Аздабянкі – файная рамкі**

- 29-30 сакавіка ў гадзінах працы Прасторы

Жывёла, партрэт якой намалявала Юлія Канечная (ці вы самі!) заслугоўвае адпаведнай аправы! Заахвочваем вас зрабіць сваімі рукамі каларовыя рамкі, якія стануць цудоўнай дэкарацыяй для вашага пакою!

**Міні-загадкі**

- 29-30 сакавіка ў гадзінах працы Прасторы

Дзе схаваліся жывёлкі з міні-выставы?! Дапамажыце нам знайсці іх сляды!

**Мой найлепшы адпачынак**

- 29-30 сакавіка ў гадзінах працы Прасторы

Якім чынам вы адпачываеце? Ці ў вас ёсць любімыя формы рэлаксу? Адкажам на гэтыя пытанні і разам створым лясную інсталяцыю!